*Тацяна Пладунова*

# АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ І ЭТАПЫ ЭТНАКУЛЬТУРНАГА ВЫХАВАННЯ ВА ЎСТАНОВЕ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ

Калі паразважаці, выраз: «Функцыя адукацыі не ў тым, каб вызваліць розум і дух чалавека, а ў тым, каб звязаць іх», - не будзе падаваццa штучнай інсінуацыяй. Справа ў тым, што праз а д у к а ц ы ю мы ня толькі вучымся чытаць альбо ткаць, вывучаем гісторыю, кампьютэр і грамадскія рытуалы, але ж і атрымліваем пэўныя погляды *і засвойваем спецыфічныя* спосабы мыслення. У *працэсе зносінаў паміж асобамі ў выхаванні і адукацыі (выхавацель - дзіцёнак, настаўнік - вучань) немагчыма наладзіць абсалютова абстрактны інфармацыйны абмен, не звязаны з пэўнай культурной традыцыяй, адасоблены ад навакольнага жыцця і асабістых якасцей яго ўдзельнікаў. Увогуле, в ы н і к сучаснай (і не толькі)* а д у к а ц ы і - прадукт сацыяльнай замовы. У *аснове адукацыі пакладзены патрэбы грамадства. Калі нейкія формы адукацыі не адпавядаюць запатрабаванням грамадства - яны паступова зыходзяць на нет. Іх месца займаюць больш патрэбныя. Праз* а д у к а ц ы ю *асоба* набывае перакананні, знаёміцца з правіламі паводзінаў і сродкамі вытворчасці ў адпаведнасці з культурнымі традыцыямі свайго грамадства *Разумець пад «адукацыяй» толькі ланцуг: дзіцячы садок- школа - ВНУ, ня толькі не зусім верна, але часцяком і шкодна. Гэткае перакананне робіць педагогаў і выхавацеляў закладнікамі ўласных памылак і выклікае беспадстаўныя надзеі з боку бацькоў і навучэнцаў, абеззбройвае сістэму адукацыі перад шэрагам праблемаў, якія яна часам сама і стварае.*

У рускамоўных педагагічных выданнях апошніх гадоў пад д э ф і н і ц ы я й «д а д а т к о в а я а д у к а ц ы я» маюць на ўвазе *працэс,* які адбываецца ва *ўстановах пазашкольнага навучання і выхавання:* у цэнтнрах пазашкольнага выхавання, дамах творчасці дзяцей і моладзі, дзіцячых аматарскіх аб'яднаннях пры ЖЭСах і ў іншых установах гэтага ж парадку. Такія асяродкі ўзніклі на хвалі індустрыялізацыі 1920-30-х гг. і былі абумоўлены спецыялізацыяй грамадства. Дарослыя мусілі шмат часу праводзіць на працы і меньш знаходзіцца разам з дзецьмі. Таму выхаванне апошніх і па-за межамі школы шмат у чым было перакладзена на педагогаў.

Сацыякультурныя ўмовы рэчаіснасці мяжы XX і XXI стагоддзяў і тыя рознаякасныя змены, якія адбываюцца ва ўсіх сферах жыцця нашага грамадства прымушаюць задумацца над тым, наколькі практыка выхавання ў пазашкольных установах Беларусі адпавядае патрэбам і задачам сацыялізацыі іх выхаванцаў, якія найбліжэйшыя перспектывы яна праграмуе. Рызыка забыцця і страты сябе як народа ў духоўнай пустэчы і адарванасці ад сваёй каранёвай культуры дзеля нас сёння відавочна. Адразу не заўважныя памылкі і прабелы ў выхаванні ў дарослай будучыні могуць адгукнуцца комплексам непаўнавартасці і самапрыніжэння, згубай сябе як асобы, няпэўнасцю ў жыцці ад усведамлення хісткасці самой яго накіраванасці, асновы. Вядома і дзяржава, і дзяржаўная сістэма адукацыі, як яе сацыяльны інстытут, у гэтым абсалютова не зацікаўлена.

Як вядома, «з «нічога» ніколі аніштo не ўзнікае». Набыць нешта новае чалавек можа толькі тады, калі ён ўжо абапіраецца на нешта «сваё», на тое самабытнае, адметнае, уласцівае яму і яго асяродку. У такім выпадку задача набыцця і напаўнення выражаецца ва ўмовах удасканалення, а не пераадолення татальнай недасканаласці: не запоўніць уласны «пусты дом», а прынесці да свайго адпачатку існуючага «дому» яшчэ болыи свету, ведаў, мудрасці. Так у сістэме выхавання ў галіне мастацтва першапачатковым этапам у развіцці дзіцёнка, у кантэксце ўводзінаў у сусветную культуру, натуральна, павінна стаць этнакультурнае выхаванне сродкамі народнага мастацтва: народнай музычнай творчасці, народнага танца і тэатра, краязнаўства, мастацкага слова, народнай гульні. Калі ўлічыць досвед працы лабараторпыі фальклору, што існуе з 1997 года, а з 2000 - аддзела фальклору НЦМТДМ (як асабісты, так і здабыты пры знаёмстве з дасягненнямі калег - расіян і балтаў, асяродкаў выхавання ў рэгіёнах Беларусі), магчыма выказаць наступныя меркаванні наконт этнакультурнага выхавання ва ўстанове дадатковай адукацыі.

Этнакультурнае выхаванне здольна быць абмежавана працай у адмысловым *фальклорным калектыве, фальклорным аб'яднанні,* альбо працай у адмысловым *этнакультурным цэнтры,* дзе розныя жанры фальклорнага мастацтва існуюць разам і з'яўляюцца абавязковымі для ўсіх навучэнцаў. У ідэальным этнакультурным цэнтры, вядома, ўсе гэтыя суполкі павінны працаваць шматпрофільна па розных накірунках дзейнасці, аб'яднаных адзінай канцэпцыяй, адзіным стандартам зместа, арганізацыі, выніка педагагічнай дзейнасці. У рэчаіснасці ж, навучэнцы займаюцца нейкім адным відам дзейнасці і толькі пры намаганнях з боку бацькоў ці педагогаў знаёмяцца і з іншымі: спевакоў і танцораў знаёмяць са спосабамі дaглядання і вырабу іх касцюмаў; а мастакі-дэкаратыўшчыкі вучацца практычна выкарыстоўваць керамічныя акарыны, тканыя пасы, скураны танцавальны абутак у гульнях, танцах, народных абрадах. Гэта не «ноу хау» і не ў апошнюю чаргу вынікае з нарматыўна-праграмнай дакументацыі, якой павінны карыстацца ўсе такія суполкі - з палажэннаў пра: гурток, студыю, цэнтр творчасці; з вучэбнымі праграмамі: «фальклорны ансамбль», «студыя народнай музыкі», «студыя дэкаратыўна-ўжыткавага мастацтва», «ансамбль народнага танца», «аркестр народных інструментаў» і з да таго падобных. Калі б адказныя асобы ў галіне выхавання і педагогі-выхавацелі больш зацікаўленна знаёміліся з дакументамі такога кшталту з часоў існавання былога СССР, шмат праблем пазашкольгнага выхавання 1990-х гадоў былі бы менш непрадказальнымі.

Увогуле пра дзейнасць па этнакультурнаму выхаванню, навучэнню народнаму мастацтву магчыма сказаць, што яна мае быць укладзенай у два этапы: *базавы* і *протапрафесійны.* Справа ў тым, што: «Будуць ці не будуць дзеці знаёміцца з народнай культурай?» - сёння вырашаюць іх бацькі. Матывацыі таго, што дзіцё прывялі ў гурток, калектыў, студыю - самыя розныя. Дзеля некаторых дарослых дастаткова таго, што беларускія хлопчык ці дзяўчынка адарваны ад маргінальнага вулічнага асяродку. Тут дастаткова агульнаразвіваючых ведаў, уменняў і навыкаў. Тым болей, што народнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мастацтва даволі дэмакратычна і, калі педагог разумны і прафесійны чалавек, дзіцё праз пэўны час спявае, рытмічна рухаецца пад музыку і не комплексуе рабіць гэта «на людзях». Некаторыя ж бацькі адразу бачаць у сваіх нашчадках будучых музыкаў, танцораў і спевакоў. Да таго ж, шмат хто з выхаванцаў далучаных да азоў, не хоча потым кідаць спевы, танец, інструмент; шукае ў гэтым самарэалізацыі, і часам даволі паспяхова. Тут агульнаразвіваючых ведаў, уменняў, навыкаў недастаткова. Таму кожны з вышэйназваных этапаў этнакультурнага выхавання мае свае асаблівасці, накіраванасць, прынцыпы і структуру.

БАЗАВЫ ЭТАП. Зыходзячы з пастуленнасці выхаваўча-навучальнага працэса ў дзіцячым калектыве, ён павінны стаць абавязковым (дзеля ўсіх навучэнцаў) адпраўным этапам працы па засваенню культуры ўвогуле. Формы рэалізацыі першага этапа залежаць ад разгалінаванасці структуры ўстановы, аб'яднання, калектыва адпаведна тым відам дзейнасці (жанрам творчасці), якія маюць быць, альбо якімі проста валодае педагог (калектыў педагогаў). Больш падрабязна пра *прынцыпы* базавага этапа (таб.1).

*Табліца 1*

Прынцыпы базавага этапа этнакультурнага выхавання

| Прынцыпы | тлумачэнне прынцыпаў |
|---|---|
| цэласнасць | форма і змест выхавання – як бесперапынная сістэма дзейнасці па засваенню каштоўнасцей традыцыйнае культуры |
| комплекснасць | арганізацыя розных відаў мастацкай дзейнасці ва ўмовах іх узаемасувязі: фальклор не аддзелены ад прыроды, жанры – не дзеляцца |
| пераемнасць | як умова бесперапыннасці выхаваўчага працэсу (два аспекта: пераемнасць паміж відамі дзейнасці і пераемнасць паміж генерацыямі) |
| шматступеннасць | кожнай ступені выхаваўчага працэса належаць адпаведныя ёй мэтавыя функцыі, што дазваляе прагназаваць вынік |

Святкаванне каляндарных святаў у дзіцячых фальклорных гуртах павінна праводзіцца з апорай на мясцовыя, мікрарэгіянальныя традыцыі святкавання, але ў свядомасці педагога павінна быць дакладная сістэма каляндарнага кола. Яе ўтвараюць 4 асноўныя беларускія святы, святы «Сонечнага крыжа». Святы гэтыя завуцца так з-за часу, да якога прымеркаваны. Людзі здаўна адзначалі дні, у якія дзень роўны з ноччу (раўнадзенствы) і дні калі дзень і ноч больш за ўсё не роўныя (сонцавароты). Яны падзяляюць гадавое «кола» амаль на 4 роўныя часткі, і калі супрацьлеглыя кропкі злучыць - атрымаюцца дзве лініі, што складаюцца ў крыж. Калі браць каляндарна, то атрымаем прыкладна наступную схему.[25]

Гэтым тэрмінам адпавядаюць святы двух сонцаваротаў (ім прыкладна адпавядаюць: летняму - Купалле і зімоваму - Каляды) і двух раўнадзенстваў (веснавому - Вялікдзень і восеньскаму - Багач - ці, як некаторыя лічаць, Дзяды). Вялікдзень павінны пэўным чынам суадносіцца і з фазамі Месяца, што, дарэчы, моцна дабаўляе неўпарадкаванасці ў галавах, і, натуральна, у працах фалькларыстаў і педагогаў- папулярызатараў навукі. Але гэта - прадмет асобнай гаворкі і сутнасці справы шмат у чым не мяняе. Больш падрабязна пра святы «Сонечнага крыжа» можна даведацца ў напрацоўках В.Калацэя [1, с.10], які першым увёў гэтую дэфініцыю ў навуковы абарот прымяняльна да святаў беларусаў. Навукоўцы лічаць, што беларускі абрадавы, святочны каляндар выдатна суадносіцца з паслядоўнасцю *квітнення - росквіту - прыпынення - занядбання* прыродных цыклаў . У такім выпадку адлік гадавога «кола» трэба пачынаць з *сакавіка,* наступная кропка - *чэрвень,* потым - *верасень* і *снежань.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 2*

Астральная аснова святаў «сонечнага крыжа»[26]




Калі вяртацца да прынцыпаў, то чатыры прынцыпы першага этапа доўгатэрміновай работы з дзецьмі абумоўліваюць ўтварэнне так званага *«поля выбару»*. Таму, што за гады «пазнавальнага вандравання» з педагогамі і сябрамі па розным галінам культуры (спеўнай, танцавальнай, гульнёвай) дзіцёнак мусіць набыць пэўныя веды ў розных галінах культуры, расквеціць свой эмацыянальны спектр, набыць першасны досвед адчування прыгажосці і непаўторнасці свету, прыроды, чалавека. Адчуўшы свае сілы ў тым альбо іншым кірунку творчай дзейнасці, ён у стане абраці тую галіну, у якой ён пачувае сябе больш здольным, таленавітым ці проста зацікаўленным. Самае важнае тое, што «поле выбару» стварае аб'ектыўную верагоднасць шматбаковага якаснага развіцця асобы, якое ў ланцугу сістэмнасці і паслядоўнасці забяспечвае арганічнасць і натуральнасць выбару напрамку будучага прафесійна арыентаванага навучання-выхавання.

Базавы этап пабудаваны на трох асноўных прынцыпах і на адным пераходным. Прынцыпы ж ПРОТАПРАФЕСІЙНАГА ЭТАПА арганічна вынікаюць з базавых. Яны адказваюць запатрабаванням хуткай сацыякультурнай адаптацыі дзіцёнка ў грамадства і ствараюць дзеля гэтага аб'ектыўныя адукацыйныя прадумовы. Магчыма акрэсліць наступныя *прынцыпы* другога этапа.

*Табліца 3*

Прынцыпы другога этапа этнакультурнага выхавання

| Прынцыпы | тлумачэнне прынцыпаў |
|---|---|
| варыятыўнасць | дыферэнцыяцыя па змесце розных праграм у залежнасці ад узросту, узроўня развіцця здольнасцей, індывідуальных асаблівасцей навучэнцаў; прадугледжвае індывідуальны «маршрут» навучання |
| ранняя прафесійная арыентацыя | арганізацыя, індывідуальны план, індывідуальныя заняткі |

Калі падсумаваць усё, што выкладзена вышэй, трэба зазначыць, што сама ідэя этнакультурнага выхавання павінна быць сёння зразумета і пачута педагогамі і выхавацелямі ўстаноў дадатковай адукацыі. На базе гэтыў устаноў яна мусіць быць арганізаваная першапачаткова. Перадусім праз комплексныя вучэбныя праграмы: першапачатковага навучання музыцы, танцам, мастацкаму слову, выяўленчаму мастацтву, дэкаратыўна-ўжыткаваму мастацтву на аснове нацыянальнай культуры.

[25] Генезіс гэтых святаў - тэма асобнай гаворкі. Хрысціянская традыцыя атрымала іх «у спадчыну» перадусім ад такіх пашыраных у антычныя часы рэлігіяў як Мітраізм і культ Непераможнага Сонца [2, с. 738] (*каментар Т.Пладуновай).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Але прэрагатыва распрацоўкі гэтых праграм (фармулёўка сацыяльнай замовы, стварэнне ўмоў дзеля яе выканання), як і самой канцэпцыі этнакультурнага выхавання, павінна належыць д з я р ж а в е . Дзеля таго, каб этнакультурнае выхаванне здольна было б несці вялікі плён, было, так бы мовіць «пастаўлена на паток» (трывала ўключана ў мадэль дзяржаўнай адукацыі і выхавання), натуральна, пажадана, як мінімум стварыць Этнакультурны цэнтр з добрай навуковай і матэрыяльна-тэхнічнай базай (магчыма ў перспектыве некалькі - традыцыйная культура рэгіёнаў Беларусі мае свае асаблівасці), альбо, першапачаткова, эксперыментальную лабараторыю пры Міністэрстве адукацыі РБ. Бо толькі на д з я р ж а ў н ы м узроўні сёння (таму, як мы жывём не ў традыцыйным грамадстве) магчыма вырашыць праблему ўключанасці новых генерацый у культурны ландшафт краіны, які складаўся не адно тысячагоддзе і які трэба ўлічваць пры мадэляванні адукацыйных стандартаў сёнешняй Беларусі. Паняцце культурнага ландшафту сёння - зусім не маляўнічая метафара. Калі тлумачыць папулярна, у яго ўваходзяць апымальныя спосабы падтрымання таго б а л а н с а ў сацыяльных (міжчалавечых) і сацыяльна-прыродных (паміж прыродай і людзьмі) адносінах, які забяспечвае паспяховае далейшае жыццё этнасу (народа), які існуе на пэўнай тэрыторыі - радзіме. Пад паспяховым жыццём тут варта мець на ўвазе цвёрды станоўчы прырост насельніцтва, сацыяльную (духоўную і матэрыяльную) стабільнасць, пры здаровай, не згвалтаванай экалогіі мясцовых біяцэнозаў.

Зараз варта сур'ёзна задацца пытаннем: «Хто будуць тыя, хто выйдзе заўтра з сённешняй установы нашай адукацыі - ці здольны будуць яны з дастатковай павагай ставіцца да прыроднага і культурнага наваколля (хаця б падтрымаць яго ў існуючым стане, не пашкодзіць)?» Як сведчыць гісторыя, ні адзін народ, этнас загінулі не толькі «па назве», але і фізіялагічна - праз выраджэнне і дэградацыю - калі непавага да традыцый і наваколля актыўна культываваліся (варыянт: такой непавазе не стаўляліся своечасовыя перасцярогі) ў іх асяродку, у тым ліку і праз адукацыйныя стандарты.

**Спіс літаратуры:**


1. Калацэй, В. «Сонечны крыж» і вытокі каляндарнай абраднасці беларусаў / В. Калацэй // Вясна на Беларусі.-Мінск : НЦТДМ, 1998.-С. 6-13.
2. Митраизм // Большой энциклопедический словарь. - 2-е изд., перераб.и доп. - М. : Большая Российская энциклопедия; СПб.: Норинт, 2002. - С. 738.


[26] Графічнымі сімваламі пазначана працягласць (суадносіны працягласці) ночы • і дня © (*каментар Т.Пладуновай).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ